■ Мелодыя лёсу

БАЯНІСТ — ПА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ

Аўтар беларускага, насамрэч народнага, шлягера быў вымушаны на вуліцы ў Амерыцы зарабляць на ежу

«Чарка на пасашок» — песня, вядомая не толькі ў Беларусі. Напэўна, гэты шлягер будуць спяваць і праз 100 гадоў. Шмат хто думае, што музыка і словы гэтай песні — народныя. І нямногія ведаюць, што напісалі яе не так ужо і даўно — у 1998 годзе — два Аляксандры: Балотнік і Лягчылаў. Кампазітар Балотнік, які жартам называе сябе «баяніст па нацыянальнасці», напісаўшы «народны шэдэўр», з'ехаў жыць у ЗША, дзе жыў без малога 12 гадоў. Аляксандр Пятровіч не ўтойвае, што часамі жылося яму за акіянам не соладка. У прыватнасці, зарабляў на вуліцы — іграў на баяне. І рабіў гэта вельмі адораны чалавек, які скончыў кансерваторыю (па класе баяна. — Аўт.), быў музычным кіраўніком у Дзяржаўным камітэце па тэлебачанні і радыёвяшчанні, працаваў у папулярным ансамблі народнай музыкі «Бяседа».



Аляксандр Балотнік, дарэчы, аўтар самых розных па жанру песень: лірычных, абрадавых. Адна з песень кампазітара «Ефрасіння» прагучала падчас адкрыцця Палаца Рэспублікі, чым ён ганарыцца. Калі працаваў у этнаграфічнай групе «Жывіца», збіраў адпаведны «матэрыял» — па вёсках, хутарах, апрацоўваў песні нашых продкаў.

Некалькі гадоў таму ён вярнуўся з эміграцыі. Жыве ў родным Лепелі, Мінску... Праўда, гаворыць, што дома свайго няма, бо толькі прапісаны ў бацькоў.

Падчас размовы з карэспандэнтам «Звязды» кампазітар прызнаўся, што гэта ён прыдумаў самыя вядомыя словы песні, якая стала яго творчай візіткай. Усю музыку песні напісаў не адразу — спачатку з'явіўся славуты прыпеў. І здарылася гэта пасля бяседы.

На YouTube кажушок стаў... карэньчыкам

— Як я напісаў песню «Чарка на пасашок»? Спачатку ў мяне быў прыпеў — жалезны такі (напявае. — **Аўт**.). Можа быць, з паўгода ніяк не мог яшчэ нешта дапісаць. І ўжо думаў, што гэты прыпеў ні ў што не выльецца. Але, напэўна, падсвядомасць «нешта такое» чакала. І потым гэта здарылася. Быў у мяне сябар у гасцях, вырашыў я праводзіць яго да таксі, а так холадна на вуліцы было... Кажу яму: «На пасашок — на марозе кажушок»... Як славяне кажуць: «100 грамаў выпіў, быццам з роднымі пагаварыў».

І ўспрынялі людзі потым словы пра «пасашок». Для народнай песні, напэўна, важна, калі словы простыя, зразумелыя ўсім, — успамінае кампазітар.

Музыкант вельмі перажывае з-за таго, што яго сябар Аляксандр Лягчылаў, аўтар усяго тэксту шлягера, памёр. Паводле слоў Аляксандра Балотніка, яны разумелі адзін аднаго нават не з паўслова, а «з паўлітары».

Кампазітар прызнаўся, што за выкананне яго песні №1 атрымлівае не такія ўжо і вялікія «аўтарскія». Багацеем ад пералічэння грошай не стаў. Яму прыемна, што спяваюць пра пасашок не толькі ў Беларусі.

— На YouTube ёсць «хохма»: калектыў аж з Магнітагорска, калі выконвае маю песню, спявае «на морозе корешок». Думаю, які «корешок»? А калектыў цікавы: у іх багатыя касцюмы, 10 гадоў ужо выступаюць. Кіраўнік ансамбля мне потым напісаў: «выбачайце, што мы няправільна пераклалі слова». А як яны маглі правільна перакласці, калі не ведаюць беларускай мовы? — працягвае кампазітар.

Мне казалі, што эміграцыя — гэта сур'ёзнае выпрабаванне. Слухаў аднаго, другога і думаў, што, напэўна, дрэнны ты скрыпач, калі на вуліцы выступаеш... А потым і ў мяне такое было.

Ён здзіўляецца, калі суразмоўцы не могуць успомніць назвы іншых яго песень. Напрыклад, «Будзь здаровы, гаспадар» — таксама вядомая. Калі Якаў Навуменка, якога, на жаль, таксама ўжо няма з намі, выканаў упершыню гэтую песню на «Дажынках», яна адразу стала папулярнай.

— А ўсе ўспамінаюць менавіта «пасашок». Ёсць у мяне не адна песня на застольную тэму... Вам падабаецца такое? Гэта трэба? Або лепш тое, што Стас Міхайлаў спявае? — пытаецца ён у мяне.

Міф пра Амерыку — ад Галівуда

— Калі хочаце запытаць пра эміграцыю, калі ласка, да мяне звяртайцеся. З'ехаў я ў ЗША ў 1998 годзе. Памятаю, складаны той год быў. Нам з жонкай здавалася, што трэба ехаць з Беларусі. Тым больш я ў Штатах раней на гастролях выступаў, і прымалі маю творчасць вельмі добра. Мая жонка настойвала, каб паехаў. Так і зрабіў, а потым паклікаў сям'ю да сябе. Гэта было няправільна. Але я вельмі цаню той досвед, які мне дала эміграцыя. Я ведаю, што такое Брайтан, дзе чуў ад знаёмых, таксама эмігрантаў: «Саня, прывітанне!» І ведаю, што такое рэстаран «Адэса». Я жыў на 6-м Брайтане , а на 4-ы вадзіў дзіця — у садок. Жыў спачатку ў Нью-Ёрку, а перад вяртаннем у Беларусь — у Філадэльфіі. Я, перад тым як з'ехаў за мяжу, пабываў у многіх краінах. У нямецкім гарадку выпадкова сустрэўся і гаварыў са знаёмымі, якія вучыліся ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Памятаю, мне казалі, што эміграцыя — гэта сур'ёзнае выпрабаванне. Слухаў аднаго, другога і думаў, што, напэўна, дрэнны ты скрыпач, калі на вуліцы выступаеш... А потым і ў мяне такое было. Памятаю, у Амерыцы разам з сябрам давялося іграць на вуліцы: я — на баяне, а ён — на скрыпцы. Рабілі гэта, каб было на што паесці. Падыходзілі розныя людзі. Слухалі і хвалілі, казалі, што добра іграем, і грошы нам клалі, — расказвае Аляксандр Пятровіч.

Паводле яго слоў, славутая «амерыканская мара» ўзнікла дзякуючы Галівуду.

— Так, у адным з інтэрв'ю я сказаў, што ледзь у Амерыцы не здох. Не, не было ў мяне ніякай моцнай хваробы. Проста ёсць нейкі падман у амерыканскай мары. Што гэта за мара, бадай, усім вядома. І ў мяне таксама такое было. Памятаю, прыехаў, сяджу ў нумары і думаю: ну вось, у мяне ўсё добра, я ўжо сюды прыехаў, замацаваўся. Але жыццё — складаная рэч... У мяне дачка ў Амерыцы і сёння жыве. Яна прыехала туды, калі ёй не было і чатырох гадоў. Тэма пра дачку — балючая, таму што я не бачу яе. Калі яе мама, мая жонка, памерла ў Амерыцы, дачка адразу стала занадта дарослай — у 12 гадоў. Мама яе пайшла з жыцця, а мяне тады не было побач, бо жылі мы ў розных штатах, — з болем расказвае кампазітар.

Для народнай песні, напэўна, важна, калі словы простыя, зразумелыя ўсім.

Ён прызнаўся, што мае траіх дзяцей — ад трох жанчын.

Чаму вярнуўся ў Беларусь? Як гаворыць кампазітар, гэта ўжо зусім іншая тэма. Сказаў, што пасля ЗША правінцыйны беларускі гарадок Лепель для яго — магчымасць жыць на малой радзіме, дзе хочацца памерці.

Што тычыцца творчасці, ён не разумее тых, хто выходзіць на сцэну, не маючы голасу. Падчас свайго сольнага канцэрта ў Віцебскай філармоніі, які адбудзецца 22 красавіка, абяцае прыемна здзівіць публіку новымі шлягерамі і сапраўдным вакалам. Выканае не толькі свае песні, але і хіты Гладкова і Карызны, замежныя папулярныя песні.

Дарэчы, кампазітар не разумее, чаму ў Віцебску, «абласной сталіцы», як казаў Марк Фрадкін, славуты яго ўраджэнец Віцебска, рэдка можна пачуць беларускую мову. Аўтар шлягера з задавальненнем пераходзіць на беларускую мову, калі суразмоўца беларускамоўны. Тлумачыць гэта тым, што, напрыклад, паэты, з якімі ён супрацоўнічае, размаўляюць толькі па-беларуску. Але і на англійскай мове ён будзе рады пагутарыць — было б з кім.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Добрая слава лепш за золата



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г .Дзяржынск.

Па гарызанталі: **1**. ... — гразь, розум — золата (прык.). **5**. Золата агнём, а ... бядой пазнаецца (прык.). **8**. Май — валам дай, а сам на ... уцякай (прык.). **9**. Добрая ... лепш за золата (прык.). **12**. ... не гнецца, а золата не ржавее (прык.). **14**. Шчасце не ..., пад нагамі не валяецца (прык.). **17**. «Цябе, мой луг і бераг родны,\\Дзе льецца ... срэбраводны». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля» («Леснікова пасада») . **18**. Мера масы алмазаў і іншых каштоўных камянёў. **19**. Хай жонка хоць ..., абы рогі залатыя (прык.). **20**. Сярэбраная ... . Невялікі снарад у патроне, якім, паводле павер'я, можна забіць вупыра. **23**. Пушны звярок сямейства куніц. **24**. Частка павозкі, аўтамашыны. **29**. Месяц — серабро, а чырвонае ... — золата (прык.). **31**. ..., або гушкалка. **33**. Мужчынскае імя. **34**. Прэснаводная рыба. 35. Гні ..., пакуль маладзенькая (прык.). **36**. Сальта- ... . Скачок з пераваротам цела ў паветры.

Па вертыкалі: **1**. Гняздо бусла; каб прывабіць яго, у ... клалі кавалак медзі або жалеза. **2**. ... — птушка вясенняя (прык.). **3**. Рака, левы прыток Прыпяці. **4**. Дарагое ... ў Хрыстоў дзень (прык.). **6**. Валакністая тканка раслін. **7**. Жалезная ... — не ўсякага доля (прык.). **10**. Пара ды ... даражэй за золата (прык.). **11**. ... Юр'і, ды абодва дурні; адзін галодны, а другі халодны (прык). **13**. Цвёрды тугаплаўкі метал светла-шэрага колеру. **15**. Камера халадзільніка (разм.). **16**. Каштоўны камень чырвонага колеру. **21**. Каб не ... ў роце, хадзіў бы ў злоце (прык.). **22**. Слова — серабро, ... — золата (прык.). **25**. ... пасля абеду — серабро, а да абеду — золата (прык.). **26**. Госць першы дзень — золата, другі дзень — срэбра, а на трэці — ..., і дадому едзь (прык.). **27**. У матэматыцы невядомая велічыня. 28. Старадаўняя іспанская сярэбраная манета. **30**. Жалеза з'ядае ..., а сэрца — смутак (прык.). **32**. Электрычна зараджаная часціца. **33**. Саламяны ... лепш за жалезную бойку (прык.).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ПАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Багацце. 5. Чалавек. 8. Печ. 9. Слава. 12. Бугат. 14. Падкова. 17. Нёман. 18. Кадат. 19. Каза. 20. Кунг. 23. Шкна. 24. Куваў. 29. Сонейка. 31. Апані. 33. Міпон. 34. Язь. 35. Гаміка. 36. Матрапе.

Па вертыкалі: 1. Бусляика. 2. Грак. 3. Цна. 4. Рейка. 6. Луб. 7. Вона. 10. Час. 11. Два. 13. Таитат. 15. Мадазіка. 16. Карбункул. 21. Дзіка. 22. Мадчанне. 25. Сон. 26. Медаль. 27. Іс. 28. Рзат. 30. Ірка. 32. Іон. 33. Міп.

Даты Падзеі Людзі

Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. 11 красавіка 1945 года вязні Бухенвальда на чале з інтэрнацыянальным палітычным цэнтрам узнялі ўзброенае паўстанне, у выніку якога захапілі лагер і ўтрымлівалі яго да прыходу саюзных войскаў.

1503 год — нарадзіўся Франчэска Парміджаніна, італьянскі мастак. З ранняга дзяцінства ў Франчэска Мацола, якога называлі Парміджаніна (па месцы яго нараджэння), выявіўся яскравы талент да малявання. У шаснаццаць гадоў ён напісаў вобраз святога Яна, які хрысціць Ісуса Хрыста. Пазней Франчэска выразшыў паспрабаваць сябе ў рабоце над фрэскай і дасягнуў значных поспехаў. Па-свойму пераасэнсаваўшы творчасць Мікеланджэла і Рафаэля, мастак стаў адным з вядучых прадстаўнікоў такой плыні ў еўрапейскім мастацтве, як маньерызм, што ў перакладзе з італьянскай азначае «прыём», «манера». Партрэты Франчэска Парміджаніна прасякнуты духам арыстакратычнай замкнёнасці і глыбокай унутранай трывогі. Віртуознае майстэрства мастака выявілася і ў яго шматлікіх малюнках і першых у Італіі афортах.

1550 год — адкрылася Брэсцкая друкарня, першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Дзейнічала пад апекай канцлера ВКЛ і старасты брэсцкага Мікалая Радзівіла Чорнага да 70-х гадоў XVI стагоддзя. У ёй было выдадзена 40 кніг на польскай і лацінскай мовах, у тым ліку «Брэсцкая Біблія» (1563) — адно з самых поўных і лепшых выданняў таго часу; вядомая як «Радзівілаўская Біблія».



1959 год — 55 гадоў таму нарадзіўся (вёска Жалвінец Глускага раёна) Леанід Аляксандравіч Булавін, беларускі вучоны ў галіне земляробства і аграэкалогіі, доктар сельскагаспадарчых навук (2003), прафесар (2013). У 1980 годзе скончыў БСГА. Аўтар навуковых прац па пытаннях рэсурсазбяражэння і зніжэння негатыўных экалагічных наступстваў ад выкарыстання сучасных сродкаў інтэнсіфікацыі ў земляробстве.

Было сказана

Якуб Колас, народны паэт Беларусі:

«Чалавеку заўсёды мала, не хватае: Ці ёсць канец яго патрэбам?»

■ Свет паэзіі

ЛЕКАВАННЕ ЧАЛАВЕЧЫХ ДУШ

У прадмове да беларускага выдання паэзіі Махтумкулі прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў назваў вершы класіка «духоўнымі лекамі, што ўтрымліваюць у сабе ўсё цудадзейнае, што неабходна для здароўя чалавека».



Ёмісты том перакладаў з паэзіі Махтумкулі носіць назву «З кубка вечнасці мёд». Гэта — другая кніга, якая прадстаўляе ў Беларусі творчасць легендарнага песняра. Першы зборнік — «Салавей шукае ружу» — пабачыў свет яшчэ ў серыі «Паэзія народаў СССР». Сярод перакладчыкаў Махтумкулі былі Уладзімір Караткевіч, Алег Лойка, Максім Танк... У новым томе поруч з перавасабленнем вобразаў, мастацкіх сімвалаў туркменскага народа сучаснымі беларускімі паэтамі пададзены пераклады Уладзіміра Шахаўца, Хведара Жычкі, Артура Вольскага, Пятра Прыходзькі, Алеся Звонака. Ладнай падборкай прадстаўлена і выключна шчырая, праніклівая праца народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Большую частку сучасных перакладаў здзейсніў Казімір Камейша. Маштабы зробленага ім уражваюць: дзясяткі вершаў, сотні строф...

Варта нагадаць, што ў свой час шмат для адкрыцця свету паэзіі Махтумкулі зрабіў ураджэнец Беларусі Аляксандр Ходзька, паэт, фалькларыст, славіст, усходазнавец, які нарадзіўся ў 1804 годзе ў Крывічах, на Мядзельшчыне. Ён першым у сваіх кнігах, выдадзеных у Санкт-Пецярбургу, Лондане і Парыжы, апісаў і працытаваў эпас пра Кёр-Аглы, вершы туркменскіх паэтаў Махтумкулі і Кемінэ, туркменскі народны фальклор.

У выданні кнігі «З кубка вечнасці мёд» удзельнічалі Пасольства Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь, Нацыянальны інстытут рукапісаў Акадэміі навук Туркменістана.

Максім ЗАЗЕРКА.

■ Запрашальнік

Сустрэча з... птушкамі

Выстава птушак адбудзецца 12-13 красавіка ў агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы».

Будуць прадстаўлены найбольш прыгожыя члены мясцовага птушынага царства — больш за 30 відаў птушак. Для гасцей падрыхтавана цікавая анімацыйная праграма з конкурсамі і прызамі. Можна будзе сфатаграфавацца з паўлінамі, якія пахаджваюць па тэрыторыі комплекса, а таксама самім выпусціць у неба галубоў, загадаўшы жаданне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У Мінскім заапарку — навасёлы

Гэта тры кенгуру, два ўсходнія калобусы і японская макака.

Як расказала намеснік дырэктара ўстановы Наталля Лебедзева, навасёлы прыехалі ў Мінск з Калінінградскага заапарка. Жывёл аддалі, каб пазбегнуць кровазмяшэння. Напрыклад, калобусаў у Калінінградскім заапарку нават з лішкам — 11 асобін.

Макака Екі і калобус Цібул знаходзяцца на каранціне. Убачыць іх пакуль нельга, яны часова жывуць ва ўнутраных памяшканнях. Усяго ў заапарку ўтрымліваецца 12 асобін пяці відаў прыматаў: чатыры гамадрылы, чатыры чырвоныя мартышкі, капуцын-плакса, дзве японскія макакі, усходні калобус.

Кенгуру Бенета адаптаваліся, іх пасялілі ў вулічных вальерах (за шклом). Паглядзець на сумчатых ужо могуць усе ахвотнікі. Гэтыя жывёлы маюць крыху меншыя памеры і больш доўгую шэрсць, чым іх сабраты з мацерыковай часткі Аўстраліі.

Надзея ІЛЬЯШУК, «Мінск—Навіны»

Дарагую сястрычку ***Людмілу Рыгораўну Грук*** *з Барысава віншую з 60-годдзем!*

Жадаю здароўя, цяпла, дабра, радасці.

Надзея, *г. Новалукомль.*

НАРОДЖАНЫЯ 11 красавіка

Яны заўсёды ідуць крок у крок з часам, ведаюць, што такое — рабіць кар'еру ў свеце, дзе перамагае мацнейшы. Яны ўсведамляюць, што калі затрымацца, то іншыя абгоняць, а перспектыва бачыць чужыя спіны не захапляе гэтых людзей. Расштурхоўваць навакольных — не ў іх правілах: яны перакананы, што прыйдзе час — і іх убачаць і ацэняць. Інтуіцыя дапамагае ім зразумець, што добра і карысна, нават калі для іншых гэта падробка і бясцэнак. Вылучаюцца патрабавальнасцю і самакантролем, але ў асабістым жыцці дазваляюць сабе расслабіцца (аднак пры адной умове — не аказацца пры гэтым смешнымі).

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.19	20.04	13.45
Віцебск	— 6.06	19.56	13.50
Магілёў	— 6.09	19.54	13.45
Гомель	— 6.08	19.48	13.40
Гродна	— 6.34	20.18	13.44
Брэст	— 6.38	20.16	13.38

Месяц

Першая квадра 7 красавіка. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Івана, Кірылы, Марка.*
К. *Ізольды, Лявона, Станіслава, Філіпа.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +10..+12°С	КІЕЎ +5..+7°С	РЫГА +10..+12°С
ВІЛЬНЮС +10..+12°С	МАСКВА +5..+7°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +3..+5°С

УСМІХНЕМСЯ

Муж:

— Слухай, Галя, а навошта ты ўсе гэтыя кулінарныя перадачы глядзіш? Ты ж нават катлеты добра пасмажыць не можаш!

Жонка (з усмешкай):

— Федзя, не смяшы мяне. Ты ж эротыку таксама глядзіш...

Рэцэпт стройнасці для жанчын: Сняданак з'еш сама, абед раздзялі з катом, вячэру аддай мужу.

Дзве старыя сяброўкі.

— Прывітанне! Зоя, няўжо гэта ты? Гэта ж трэба — цэлых 15 гадоў не бачыліся! А ты так папаўнела, я спачатку цябе і не пазнала...

— Ты таксама, Света, так змянілася, што, калі б не твая сукенка ў клетку, я б цябе таксама не пазнала!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 22.047. Індэкс 63850. Зак. № 1509.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 красавіка 2014 года.